# УПЛЫЎ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІКІ НА ВУЧЭБНА – ВЫХАВАЎЧЫ ПРАЦЭС

***І.М. Барадай***

Навуковы кіраўнік - к.п.н., д.гіст.н. ***С.В. Снапкоўская***

*Нацыянальны інстытут адукацыі*

Час, у які мы жывем, пазначаны не толькі пэўнай сацыяльнай напружанасцю і эканамічнай нестабільнасцю ў грамадстве, але і тым, што гэтыя акалічнасці адмоўным чынам адбіліся на нармальным функцыянаванні сістэмы адукацыі.

На змену першапачатковай разгубленасці па пытаннях выхавання паступова прыйшлі актуальныя пошукі педагагічнай навукай і адукацыйнымі ўстановамі той асновы, на якой можна было б будаваць нацыянальную сістэму адукацыі і выхавання.

Каб пазбегнуць дэвальвацыі не толькі маральных, але і агульначалавечых каштоўнасцей, педагогі вымушаны былі звярнуцца да тых спрадвечных крыніц, якія праверaны жыццем, захаваны цэлымі пакаленнямі, абаперціся на тыя цвярдыні, якія здольны з гонарам выстаяць сярод наймацнейшых узрушэнняў, гэта значыць прызнаць асновай сістэмы адукацыі і выхавання нацыянальную культуру, у яе гістарычным аспекце, часткай якой з,яўляецца народная педагогіка.

Гэта ідэя знайшла свае адлюстраванне ў многіх афіцыйных праграмах і дакументах як, напрыклад, у «Канцэпцыі адукацыі і выхавання ў Беларусі», «Канцэпцыі выхавання ў нацыянальнай школе Беларусі», «Канцэпцыі рэформы агульнаадукацыйнай сярэдняй школы», дзе чырвонай ніткай праходзіць думка аб неабходнасці надання нацыянальнай сістэме адукацыі і выхавання спецыяльных рыс з улікам выкарыстання культурнай і народна – педагагічнай спадчыны, якая прызначана забяспечыць пераемнасць памјж мінулым і будучым, сувязь пакаленняў.

Так, у «Канцэпцыі адукацыі і выхавання ў Беларусі» падкрэсліваецца, што «У беларускай нацыянальнай школе належнае месца павінны заняць дзяржаўная мова, нацыянальная гісторыя, традыцыі, звычаі, міфалогія, фальклор, музыка, танцы, жывапіс, народныя гульні і г.д.» [3, с. 119].

Своеасаблівай філасофіяй у галіне выхавання дзяцей, якая складаецца на каляндарнай творчасці многіх пакаленняў, забяспечвае перадачу гістарычнага і сацыяльнага вопыту з,яўляецца народная педагогіка. «Народная педагогіка – гэта не толькі штосьці застылае раз назаўседы ўзятае, а вельмі мабільная педагагічная з,ява, дзе галоўнае – дзенасць, эфектыўнасць выхаваўчага ўплыву, што нярэдка дасягаецца ўмелым спалучэннем і ўзаемадзеяннем сродкаў і метадаў» [1, с. 120].

Выхаванне чалавека – адна з галоўных функцый чалавека. Большасць дарослых людзей не прайшлі спецыяльнай падрыхтоўкі па выхаванню сваіх дзяцей. Яны па цяперашні час выкарыстоўваюць у сваей выхаваўчай дзейнасці толькі тыя сродкі і спосабы, якія былі набыты ранейшымі пакаленнямі.

Педагог Г.С. Вінагарадаў сцвярджаў, што народная педагогіка – не сістэма навуковых поглядаў аб фарміраванi чалавека, а сукупнасць ведаў, якія вырабатаны многавекавым вопытам пакаленняў [2, с. 245]. Вялікі рускі педагог К.Д.Ушынскі раіў усім сэрцам звярнуцца да народнай педагогікі: «Толькі народнае выхаванне з,яўляецца жывой крыніцай у працэссе народнага развіцця. Толькі выхаванне, створанае самім народам, заснаванае на народных традыцыях, дапаможа народу захаваць сваю самабытнасць».

Такім чынам можна зрабіць наступныя вынікі, што змена парадыгмы адукацыі павінна праводзіцца на аснове ўліка вопыту народнага выхавання, а выкарыстанне ідэй івопыту традыцыйнага выхавання ва ўмовах агульнаадукацыйнай школы будзе спрыяць павышынню эфектыўнасці вучэбна – выхаваўчага працэсу.

**Літаратура**

1. Арлова Г.П.Беларуская народная педагогіка. Мн: Нар. Асвета, 1993. – 120 с.
2. Виноградов Г.С.Народная педагогика. – М.:Политиздат,1926. – 245 с.
3. Канцэпцыя адукацыі і выхавання ў Беларусі//АІВ. – 1993. - №12. – 119 – 156 с.